РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 123 (30511)

# ДЗЕЛЯ НАРОДАЎ І БУДУЧЫНІ




Фота БелТА.

**Галоўнай падзеяй першага дня Еўразійскага эканамічнага форуму стала пленарная сесія на тэму «Стратэгія Еўразійскай эканамічнай інтэграцыі: вынікі і перспектывы». Удзел у сесіі, на якім старшынстваваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, узялі лідары краін — членаў ЕЭАС і краін-назіральніц. Кіраўнікі дзяржаў падвялі вынікі агульнай работы на прасторы ЕЭАС, акрэслілі праблемы і задачы, якія трэба вырашыць, каб гэта пляцоўка і надалей заставалася прыкладам якаснай і плённай інтэграцыі. За тыдзень да гэтага, на нарадзе, прысвечанай падрыхтоўцы да галоўнай міжнароднай падзеі года, Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу забяспечыць гасцям максімальны ўзровень беларускай гасціннасці. І сам паказаў прыклад. Прэзідэнт асабіста сустракаў сваіх калег — кіраўнікоў дзяржаў і членаў дэлегацыі ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры. Пасля кароткага пратакола лідары перайшлі на пленарную сесію, якая прайшла не для пратакола, а для рэальнай работы ў імя сумеснай будучыні.**

СТАР. 2–4



+TV ПРАГРАМА

«ЧАС ВЯРНУЦЦА»



АД ШТУЧНАГА ІНТЭЛЕКТУ ДА ПРАМЫСЛОВЫХ РОБАТАЎ 6



ЖАМЧУЖЫНА Ў ПРЫРОДНАЙ АГРАНЦЫ 8–9



КАЛІ ЎЖО ПАЦЯПЛЕЕ? 16

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

# «НАДЫХОДЗІЦЬ ЧАС ЕЭАС 2.0. НАМ БОЛЬШ СУР'ЁЗНЫЯ ЗАДАЧЫ

**Усе намаганні —**

Сёлета Рэспубліка Беларусь старшынствуе ў органах Еўразійскага эканамічнага саюза — таму першым на пленарнай сесіі выступіў беларускі лідар. Вітаючы ўдзельнікаў Еўразійскага эканамічнага форуму, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта самая маштабная адкрытая дыскусійная пляцоўка аб'яднання. Ён выказаў упэўненасць, што абмен думкамі, які адбываўся на працягу дня, будзе карысным для далейшага развіцця ЕАЭС. У сваёй прамове беларускі лідар засяродзіўся на кірунках, развіццё якіх адкрые новы перыяд у гісторыі інтэграцыйнага аб'яднання.




## ЕАЭС НЕ ПРОСТА ФУНКЦЫЯНУЕ, А ДАСЯГАЕ ПОСПЕХАЎ

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што Еўразійскі эканамічны саюз ужо перасягнуў дзесяцігадовую мяжу з моманту стварэння. «Насуперак скептыкам, наша аб'яднанне паказала здольнасць да знаходжання ўзаемапрымальных рашэнняў і рабочых кампрамісаў. Яно не проста функцыянуе, але і дасягае поспеху па асноўных параметрах», — сказаў ён.

Беларускі лідар прывёў канкрэтныя прыклады. За 10 гадоў больш чым у 2 разы павялічыўся ўзаемны тавараабарот краін-удзельніц і на 37 працэнтаў — аб'ём знешняга гандлю. Сукупны ВУП саюза вырас амаль на 18 %, прамысловая вытворчасць — на 30 %, аб'ём прадукцыі сельскай гаспадаркі — на 25 %, грузаабарот — на 10 %, аб'ём інвестыцый — больш чым на 40 %. Узровень беспрацоўя знізіўся амаль удвая і складае менш за 3 % (2,8). Еўразійскі бізнес у поўнай меры адчуў перавагі бясшоўнага трансгранічнага гандлю і прымянення адзіных норм права, беспрашкодных узаемаразлікаў у нацыянальных валютах.

Важным дасягненнем для нашых грамадзян беларускі лідар назваў магчымасці свабоднага працаўладкавання ў ЕАЭС. Створаны лічбавы сэрвіс «Праца без меж», забяспечаны роўныя правы ў сферы пенсіённага забеспячэння, прызнанне дакументаў аб адукацыі.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў ЕЭАС з'явіліся краіны-назіральніцы на розных кантынентах: «Мы заключаем гандлёвыя пагадненні. Гэта значыць, і геаграфія, і функцыянал ЕАЭС пашыраюцца». ЕАЭС сёння разам з дзяржавамі-партнёрамі — гэта пятая частка насельніцтва свету і самае вялікае аб'яднанне па плошчы.

**«На гэтай велізарнай тэрыторыі сканцэнтравана чвэрць усіх разведаных відаў карысных выкапняў. Наш саюз займае: першае месца ў свеце па здабычы нафты; другое — па здабычы газу і вытворчасці мінеральных угнаенняў; трэцяе — па вытворчасці пшаніцы, бульбы, жывёлагадоўчай прадукцыі і па працягласці чыгунак; чацвёртае — па здабычы вугалю, вытворчасці чыгуну і сталі, мяса і па агульнай працягласці аўтамабільных дарог», — адзначыў Прэзідэнт.**

## ПАТЭНЦЫЯЛ АБ'ЯДНАННЯ НЕ ЗАДЗЕЙНІЧАНЫ Ў ПОЎНАЙ МЕРЫ

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што супакойвацца на дасягнутым ні ў якім разе нельга. І пацвердзіў свае словы фактамі. «Валавы ўнутраны прадукт ЕАЭС складае ўсяго толькі каля 4 % у структуры сусветнага. Пра што гэта сведчыць? Што патэнцыял нашага інтэграцыйнага аб'яднання не задзейнічаны ў поўнай меры, — патлумачыў ён. — І за наступныя 10 гадоў мы павінны як мінімум падвоіць гэту лічбу, надаўшы новы імпульс інтэграцыі».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што стратэгію развіцця саюза на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў прымалі да 2025 года. «Скажу прама: не ўсе, парадку 18 найважнейшых паказчыкаў мы не выканалі. Рабіце высновы адсюль. Таму надыходзіць час ЕЭАС 2.0, як мы называем у Беларусі. Нам трэба ставіць перад сабой новыя, больш сур'ёзныя задачы і іх рэалізоўваць, — заявіў беларускі лідар. — Вырашэнне гэтых праблем залежыць ад Еўразійскай камісіі, нашага апарата. І кіраўнікоў дзяржаў, кіраўнікоў урадаў. У кожнага з маіх калег, прысутных тут, ёсць разуменне, якімі мы хочам бачыць нашы краіны ў сярэдне- і доўгатэрміновай перспектыве».

Прэзідэнт перакананы, што трэба знаходзіць і настойліва рэалізоўваць сумес-

## Даслоўна

**Прэзідэнт Расіі Уладзімір ПУЦІН:**

— За час існавання саюза істотна ўмацаваўся агульны эканамічны патэнцыял краін пяцёркі. Адбыўся рост прамысловай вытворчасці ў краінах ЕАЭС, павелічэнне інвестыцый у асноўны капітал. Гэта вельмі добрыя паказчыкі. Ва ўсялякім выпадку ў сярэднетэрміновай перспектыве рост гарантаваны. Зразумела, пяцёрка не збіраецца спыняцца на дасягнутым. Працягваецца работа над умацаваннем інтэграцыйных механізмаў, павышэннем аўтарытэту і ўплыву Еўразійскага эканамічнага саюза на міжнароднай арэне.

ЕАЭС па праве зацвердзіўся ў ліку аднаго з ключавых цэнтраў глабальнага развіцця. Аб'яднанне заўсёды адкрыта да супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі замежнымі партнёрамі. Яно робіць рэальны ўнёсак у стварэнне на агульным еўразійскім кантыненце вялікай прасторы партнёрства, супрацоўніцтва і эканамічнага росту. Прасторы, дзе паважаюць правы кожнай дзяржавы на ўласную мадэль развіцця і ўлічваюць інтарэсы ўсіх удзельнікаў. Перакананы, што менавіта на такой справядлівай і раўнапраўнай аснове і павінна выбудоўвацца ўзаемадзеянне ў новым шматпалярным свеце. Тут мы на правільным шляху і рухаемся добрымі тэмпамі ва ўзаемаадносінах з нашымі партнёрамі».

* * *

**Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт ТАКАЕЎ:**

— Па прагнозах, да 2030 года лічбавізацыя і штучны інтэлект могуць прынесці ў сусветны ВУП больш за 15 трыльёнаў долараў і замяніць да 300 мільёнаў працоўных месцаў, але стварыць цалкам новыя прафесіі. Лагічна, што ўзмацняецца сусветная канкурэнцыя ў гэтай галіне. У ЕАЭС ёсць гістарычны шанц уключыцца ў гэты глабальны працэс. Важна своечасова выкарыстоўваць акно магчымасцяў, каб умацаваць нашу ролю ў лічбавым светапарадку, які фарміруецца. ЕЭАС павінен выйсці ў лідары ў распрацоўках у сферы штучнага інтэлекту. Гэта значыць, лічбавізацыя і штучны інтэлект павінны стаць безумоўным прыярытэтам ЕАЭС. Передавыя лічбавыя тэхналогіі здольныя надаць магутны імпульс гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву нашых краін. Для гэтага ў нас ёсць усё неабходнае: стратэгічныя дакументы, назапашаны вопыт, разуменне агульных запытаў. Галоўнае, нам трэба дзейнічаць узгоднена, прагматычна і на апярэджанне.

* * *

**Прэзідэнт Кыргызстана Садыр ЖАПАРАЎ:**

— З моманту стварэння саюза прамысловасць дзяржаў-членаў дэманструе паступальную дынаміку росту і за апошнія 10 гадоў вырасла на 29 %, перавысіўшы 1,5 трыльёна долараў ЗША па выніках 2024 года. Такія дасягненні сталі магчымымі дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву дзяржаў-членаў і прагматычнаму падыходу ў паглыбленні

# ТРЭБА СТАВІЦЬ ПЕРАД САБОЙ НОВЫЯ, І ІХ РЭАЛІЗОЎВАЦЬ»

## у імя чалавека

ныя меры, каб інтэграцыя давала дабаўленую вартасць. «Каб людзям было відавочна: самастойна, без саюза мы б не змаглі гэта зрабіць так хутка і так добра», — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што, калі падпісвалі Дагавор аб саюзе, 2025 год быў вызначаны своеасаблівым гарызонтам, за якім пачынаецца новы этап у дзейнасці аб'яднання.

**«І сёння ў нас ёсць усе падставы, яшчэ раз гэта падкрэслю, прадставіць асобныя элементы саюза версіі 2.0, — заявіў ён. — У сітуацыі сусветнай турбулентнасці важна не плесціся ў хвасце падзей, а самім уплываць у пазітыўным ключы на глабальны парадак дня, мець прадуманыя мадэлі рэагавання на знешнія выклікі».**

### У ЕЭАС ПАВІНЕН БЫЦЬ СВОЙ ФІРМЕННЫ ПРАДУКТ

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, каб не згубіцца на перанасычаным сусветным рынку, у ЕАЭС версіі 2.0 павінен быць свой фірменны Еўразійскі прадукт — прыкметны, запатрабаваны і па-сапраўднаму агульны для ўсіх краін-удзельніц. Ён назваў гэта базавай умовай заваёвы і ўтрымання пазіцый на сусветнай арэне.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў пачатку года ў звароце да кіраўнікоў дзяржаў у якасці старшыні аб'яднання Беларусь заявіла аб неабходнасці кааперацыі па тых кірунках, без якіх сёння немагчыма ўпэўнена адчуваць сябе сярод сусветных эканамічных лідараў. Гэта электратранспарт, мікраэлектроніка, робататэхніка, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, новыя матэрыялы. Як адзначыў беларускі лідар, работа па кааперацыйных праектах пачата, прыняты адпаведныя рашэнні, у саюзным бюджэце на гэтыя мэты прадугледжаны немалыя грошы.

**«Трэба не даганяць адзін аднаго ў традыцыйных галінах, а разам стаць лідарамі ў новых, такіх, пра якія мы пакуль, можа, нават не думаем. Яны самі прыйдуць. Аб'яднаўшы патэнцыялы нашых эканомік, мы ў стане стварыць унікальны Еўразійскі прадукт — ад самалётаў і цягнікоў да лічбавых рашэнняў і штучнага інтэлекту.**

Сёе-тое мы ўжо ў гэтых абласцях навучыліся рабіць, — падкрэсліў Прэзідэнт. — У саюзе версіі 2.0 трэба не толькі аб'ядноўваць патэнцыялы, але і рацыянальна размяркоўваць намаганні і рэсурсы». У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў касмічную сферу. Відавочна, што кожнай краіне патрэбен космас, але не ў кожнай для гэтага ёсць касмадром. У рамках саюза такі падыход правільны і ў іншых галінах.

**«Замест канкурэнцыі ў вытворчасці адных і тых жа тавараў, стварэння новых дублюючых магутнасцяў трэба засяродзіцца на ўзаемадапаўненні нацыянальных эканомік, убудоўванні ў вытворчыя ланцужкі наяўных флагманаў. Фарміруючы тым самым агульныя таварныя прапановы для ўнутранага рынку ЕАЭС і для экспарцёраў, — перакананы беларускі лідар. — Для прарыву патрабуецца аб'яднаць навуковы, інжынерны і фінансавы патэнцыялы».**

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, добрым рашэннем можа стаць стварэнне сумесных даследчых і інавацыйных цэнтраў, якія будуць распрацоўваць новыя тэхналогіі і прадукты. «Звязка навукі і вытворчасці з арыенцірам на экспарт будзе забяспечваць і тэхналагічны суверэнітэт, і канкурэнтаздольнасць нашых тавараў на сусветным рынку», — патлумачыў ён.




### ТРАНСПАРТНА-ЛАГІСТЫЧНЫЯ КАЛІДОРЫ. ТРЭБА ЗАМАЦАВАЦЬ ПОЯС ДОБРАСУСЕДСТВА

«Сфера паслуг — гэта палова сукупнага валавога ўнутранага прадукту ЕАЭС. Рэзерваў яе росту велізарная колькасць, маса», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

«Пунктам для сумеснага прыкладання намаганняў з перспектывай неадкладнай аддачы ў маштабах саюза з'яўляюцца сучасныя транспартныя калідоры, якія створаныя на аснове нацыянальных сегментаў і аб'ядноўваюць вялікую Еўразію. На поўдні і ўсходзе ў нас сфарміраваны пояс добрасуседства. Трэба змацаваць яго сеткай аўтамабільных дарог і чыгунак і транспартна-лагістычных хабаў, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Інтэграваныя еўразійскія транспартна-лагістычныя калідоры павінны стаць разумнымі, мультымадальнымі, экалагічнымі артэрыямі з адзінай лічбавай платформай адміністравання.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

інтэграцыі ў сферы прамысловасці і аграпрамысловага комплексу ў саюзе.

Неабходна павысіць узровень лакалізацыі вытвочасцяў на тэрыторыях дзяржаў — членаў ЕАЭС, сфарміраваць канкурэнтаздольны навукова-даследчы патэнцыял прамысловай і аграпрамысловай галіны, знайсці крыніцы фінансавання на даследаванні і рэалізацыю інавацыйных праектаў, стварыць сумесныя цэнтры кампетэнцый у кожнай дзяржаве — члене ЕАЭС, сфарміраваць механізм падтрымкі сумесных навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ у цэлым.

***

**Прэм'ер-міністр Арменіі Нікол ПАШЫНЯН:**

— Мы перакананы, што менавіта лічбавізацыя адкрывае новыя магчымасці ў эканоміцы, сістэме дзяржаўнага кіравання і сацыяльнай сферы. У Арменіі ўжо рэалізавана архітэктура міжведамаснага ўзаемадзеянння, дзякуючы чаму дзяржаўныя органы не дублірууюць інфармацыю, а атрымліваюць доступ да першакрыніц праз абароненыя каналы сувязі. Гэта дазволіла стварыць інтэграваныя лічбавыя сэрвісы, якія аб'ядноўваюць усе этапы аказання паслуг у адзіны празрысты і зручны для карыстальніка працэс. Такі падыход адкрывае новыя магчымасці для фарміравання адзінага лічбавага асяроддзя».

Арменія разглядае лічбавую трансфармацыю як інструмент ухілення бар'ераў, павышэння празрыстасці ўзаемнага гандлю. Мы адкрыты да распрацоўкі трансгранічных платформ і эксперыментальных праектаў, якія дазволяць усім нам не проста ўкараніць тэхналогіі, што існуюць, а распрацаваць цікавыя і эфектыўныя рашэнні.

***

**Прэзідэнт Кубы Мігель Дыяс-Канель БЕРМУДЭС:**

— Для паглыблення супрацоўніцтва прапаную выкарыстоўваць Кубу як лагістычны і інвестыцыйны хаб, а таксама магчымасці асаблівай эканамічнай зоны «Порт Марыэль», геаграфічныя перавагі вострава. Мы зацікаўлены ў тым, каб наша краіна стала адпраўным пунктам пашырэння паставак прадукцыі, выраблена й у ЕАЭС, у Лацінаамерыканскі і Карыбскі рэгіёны. Размова ідзе аб асабліва важным праекце, які дасць магчымасць стварыць лагістычны цэнтр для прыёму і распаўсюджвання грузаў з краін ЕАЭС у Лацінаамерыканскі рэгіён і ў зваротным напрамку.

Нам прыемна, што другі раз дэлегацыя на чале з Гандлёвай палатай Кубы бярэ ўдзел у форуме. Гэта сведчанне імкнення Кубы ўмацаваць гандлёвыя і фінансавыя адносіны з саюзам, яго дзяржавамі-членамі і назіральнікамі. Гэта краіны, з якімі нас аб'ядноўваюць выдатныя адносіны і высокі ўзровень дыялогу, заснаваны на гістарычных сувязях.

# «НАДЫХОДЗІЦЬ ЧАС ЕЭАС 2.0...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 2–3 стар.)*

**Скарачэнне часу і кошту транзіту праз Еўразію павысіць канкурэнтаздольнасць маршруту ў параўнанні з марскімі шляхамі. Дазволіць пазіцыянаваць ЕАЭС як глабальны транзітны хаб». Аляксандр Лукашэнка прапанаваў разгледзець гэту ініцыятыву сумесна з краінамі-назіральніцамі, а таксама ў рамках дыялогу ЕАЭС — ШАС.**

## ФІНАНСАВАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ. ІНВЕСТЫЦЫІ ПАВІННЫ ПЕРАСЯКАЦЬ ГРАНІЦЫ

Яшчэ адзін каталізатар росту праз сферу паслуг — фінансавая інтэграцыя. «У ЕАЭС 2.0 інвестыцыі павінны перасякаць граніцы, ствараючы новыя магчымасці. Неабходна ў самыя кароткія тэрміны завяршыць выкананне задач па фарміраванні агульнага фінансавага рынку: падпісаць і ратыфікаваць пагадненні аб стандартызаванай ліцэнзіі ў банкаўскім і страхавым сектарах, аб узаемным допуску ўдзельнікаў фінансавага рынку», — прапанаваў беларускі лідар.

## ЛІЧБАВІЗАЦЫЯ. ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ТРАНСГРАНІЧНЫ АБМЕН ІНФАРМАЦЫЯЙ

Непазбежным акцэнтам у саюзе версіі 2.0 Аляксандр Лукашэнка назваў лічбавізацыю: «Хочам мы гэтага ці не. Стварэнне адзінай лічбавай платформы для бізнесу, развіццё электроннага гандлю і выкарыстанне вялікіх даных — гэта тыя кірункі, якія дапамогуць нашым эканомікам павысіць сваю эфектыўнасць».

Паводле слоў беларускага лідара, пры гэтым унутры саюза неабходна заканчваць лозунгі аб захаванні нацыянальнага лічбавага суверэнітэту. «Наадварот, трэба на практыцы састыкаваць праграмныя платформы, якія выкарыстоўваюцца, і забяспечыць трансгранічны абмен інфармацыяй з нацыянальных баз і рэестраў, прызнаць электронныя подпісы і лічбавыя дакументы», — перакананы ён.

## ГАЛОЎНАЯ МЭТА — ПАВЫШЭННЕ ДАБРАБЫТУ ГРАМАДЗЯН

«Аднак, вырашаючы названыя прыкладныя задачы, мы павінны памятаць, што галоўная мэта развіцця саюза — павышэнне дабрабыту яго грамадзян. Усе нашы намаганні — толькі ў імя чалавека. Таму ў полі нашай увагі павінны знаходзіцца тэмы стварэння новых працоўных месцаў, кіраванай працоўнай міграцыі, атрымання адукацыі і меддапамогі, раскрыцця патэнцыялу ўзаемнага турызму», — зрабіў акцэнт Прэзідэнт.

## НАМ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА СТРАЦІЦЬ АГУЛЬНЫ РЫНАК

«У нашым распараджэнні ёсць усе інструменты, якія многія краіны толькі спрабуюць стварыць. Цяпер асноўная задача — павялічыць эфектыўнасць іх выкарыстання на карысць рэальнай інтэграцыі.

**Нельга ператварыць наш саюз у пляцоўку для пустых размоў. Наадварот, ён павінен стаць максімальна прывабным для новых удзельнікаў», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да сваіх калег і ўдзельнікаў форуму.**

Беларускі лідар звярнуў увагу на размовы, якіх так шмат апошнім часам, аб сусветнай турбулентнасці і яе пераадоленні. «Калі хтосьці з постсавецкай прасторы (гэта датычыцца эканомікі), з нас думае, што можна дзесьці праскочыць асобна, нейкую выгаду займець асобна, — памыляецца. Нам ні ў якім разе нельга страціць адзіны рынак, які дастаўся нам і яшчэ застаўся ад Савецкага Саюза», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, нельга страціць прадпрыемствы, якія дасталіся ў спадчыну з савецкіх часоў. У прыклад ён прывёў Расію, якая пасля сыходу заходніх партнёраў рэанімавала свае вытворчасці, што былі на дастаткова высокім узроўні ў Савецкім Саюзе. Паводле слоў беларускага лідара, трэба захаваць тое, што дасталася ад Савецкага Саюза, і тое, што яшчэ функцыянуе.

**«І ні ў якім разе не глядзець па баках, ніхто нас нідзе не чакае. Эканоміка нас прывядзе да таго, што мы ўсё роўна будзем разам. Гэта наша прастора, яна створана многімі пакаленнямі. І цяпер час такі, што нам на гэта трэба звярнуць самую сур'ёзную ўвагу. Толькі разам, ведаючы адзін аднаго і пакуль размаўляючы на адной мове», — заклікаў кіраўнік дзяржавы.**

Ён падкрэсліў, што ў Мінску прысутнічаюць прадстаўнікі больш як 30 краін свету, гатовых супрацоўнічаць з ЕЭАС па розных кірунках. Але ядро ЕЭАС павінна ім нешта прапанаваць, адзначыў Прэзідэнт.

Па яго словах, нельга ігнараваць праблемы, што ёсць у гэтым ядры. Аляксандр Лукашэнка прывёў у прыклад Арменію, у якой ёсць пэўныя рознагалоссі з краінамі — удзельніцамі ЕЭАС, а прэм'ер-міністр Арменіі Нікол Пашынян удзельнічае ў сесіі ў фармаце відэаканферэнцыі. Беларускі лідар адзначыў, што не можа быць вінаваты адзін бок і нельга адмахвацца ад праблем.

«Я мякка заўважыў: 18 асноўных палажэнняў з нашай стратэгіі, якая павінна была быць рэалізавана да 2025 года, да сёння не рэалізаваны, — паўтарыў Прэзідэнт. — Скажу прама, асаблівага жадання ўнікаць у гэтыя складаныя пытанні ў нас у цэлым няма. Але мы павінны сябе прымусіць, час ад нас гэтага патрабуе. Калі будзем таптацца на месцы, калі будзем рухацца павольна, нас дагоняць, затопчуць і пойдуць наперад іншыя. Як гэта, шчыра кажучы, адбываецца па многіх кірунках».

Аляксандр Лукашэнка паўтарыў, што нельга ператварыць саюз у пляцоўку для пустых размоў, — ён павінен стаць максімальна прывабным для новых удзельнікаў. «Колькасць краін, прадстаўленых на форуме, паказвае вялікую цікавасць да нашага аб'яднання. Давайце скарыстаемся гэтым момантам па максімуме!» — заклікаў Прэзідэнт.

***

Пасля плённай працы на пленарнай сесіі лідары краін азнаёміліся з выстаўкай «Дасягненні суверэннай Беларусі», размешчанай каля Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра. Флагманскія ўзоры тэхнікі прадставіла Міністэрства прамысловасці, Дзяржаўны ваенна-прамысловы камітэт, Міністэрства абароны, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. У цэнтры ўвагі — кар'ерны самазвал БЕЛАЗ-75710 грузападымальнасцю 450 тон, самы вялікі кар'ерны самазвал у свеце, першая мадэль у новым класе машын асабліва вялікай грузападымальнасці. Менавіта каля гэтага гіганта лідары краін зрабілі сумеснае фота.



## Даслоўна

***

**Старшыня Дзяржаўнага Адміністрацыйнага савета, прэм'ер-міністр Рэспублікі Саюз М'янма Мін Аун Хлайн:**

— Мы маем намер далей пашыраць патэнцыял супрацоўніцтва з дзяржавамі — членамі ЕАЭС у галіне эканомікі і гандлю. Ва ўмовах сучаснай міжнароднай абстаноўкі, спалучанай са шматлікімі выклікамі, наша агульная задача дзейнічаць, каб эфектыўна пераадольваць пагрозы. Нягледзячы на знешнеэканамічныя выклікі і санкцыі, ЕАЭС дэманструе ўстойлівы прагрэс і дасягнуў значных вынікаў за апошнія гады. Дазвольце выказаць шчырую просьбу аб падтрымцы імкнення М'янмы далучыцца да ЕАЭС у статусе дзяржавы-назіральніцы.

***

**Саветнік сапрэзідэнтаў Рэспублікі Нікарагуа па пытаннях інвестыцый, гандлю і міжнароднага супрацоўніцтва Лаўрэана Артэга Мурыльё:**

— Нікарагуа афіцыйна запытала статус назіральніка ў ЕАЭС, і мы таксама хацелі б яшчэ раз адзначыць і падкрэсліць, што для нас гэта найважнейшая мэта. Мы гатовы выканаць усе неабходныя працэдуры і патрабаванні, каб атрымаць такі статус. Мы актыўна працуем з Расійскай Федэрацыяй, Беларуссю ў рамках буйных праектаў у медыцыне, фармацэўтыцы, пастаўках абсталявання, ствараем банкаўскія інструменты, якія дазваляюць нам пераадолець тыя бар'еры, што ставяць перад намі імперыялісты з ЕС і ЗША.

***

**Старшыня Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі (ЕЭК) Бакытжан Сагінтаеў:**

— Эканамічная перавага ад функцыянавання саюза адчуваецца ва ўсіх дзяржавах-удзельніцах. Арменія за гэты перыяд павялічыла экспарт у ЕАЭС у 13 разоў, Кыргызстан — у 3,7, Беларусь — у 2,5, Казахстан і Расія — амаль удвая. Гэтыя паказчыкі — вынік сумесных намаганняў краін-удзельніц і ЕЭК. Прынцыпам нашай работы застаецца дасягненне асноватворных мэт Дагавора аб ЕАЭС: забеспячэнне свабоды руху тавараў, капіталу і працоўнай сілы. На ўнутраным рынку ўжо ліквідавана каля 100 перашкод для гандлю, прыняты 52 тэхнічныя рэгламенты, 90 % прадукцыі вырабляецца па адзіных нормах.

**Валерыя СЦЯЦКО, Вераніка КАНЮТА. Фота БелТА, Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

АКЦЭНТЫ

# БРЭНД «ЗРОБЛЕНА Ў БЕЛАРУСІ» — СІНОНІМ ЯКАСЦІ

## Наша краіна ў аснову сваёй знешняй палітыкі ставіць «эканамічную дыпламатыю»

**Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН учора, 26 чэрвеня, паўдзельнічаў у адкрыцці Еўразійскага эканамічнага форуму і агучыў вынікі ўдзелу нашай краіны ў такім інтэграцыйным аб'яднанні, як ЕАЭС.**



Фота БелТА.

### ЭКСПАРТ У КРАІНЫ ЕАЭС ВЫРАС У 2,5 РАЗА

Кіраўнік беларускага ўрада адзначыў, што такое маштабнае міжнароднае мерапрыемства — гэта ўнікальная пляцоўка, дзе прадстаўнікі дзяржаўнай улады, бізнесу і экспертнай супольнасці абменьваюцца думкамі, дзеляцца вопытам, знаходзяць шляхі вырашэння сумесных задач у розных сферах дзейнасці. Ён падкрэсліў, што высокая цікавасць да ўдзелу ў форуме пацвярджае рэальную запатрабаванасць такіх мазгавых штурмаў, і выказаў упэўненасць, што многія з удзельнікаў прыбылі сюды з папярэднімі дамоўленасцямі, ідэямі па актывізацыі супрацоўніцтва, укараненні новых форм і метадаў работы.

— Беларусь у аснову сваёй знешняй палітыкі ставіць «эканамічную дыпламатыю», у падмурку якой — спрашчэнне працэдур гандлю, імкненне выбудаваць узаемавыгадную мадэль супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Турчын. — На базе названых прынцыпаў будуецца і інтэграцыйнае ўзаемадзеянне ў рамках ЕАЭС, якое за мінулыя 10 гадоў прынесла прыкметныя вынікі і стала важным інструментам развіцця для ўсіх дзяржаў-членаў, у тым ліку і для Рэспублікі Беларусь. Так, з 2015-га да 2024-га экспарт Беларусі ў краіны ЕАЭС вырас больш чым у 2,5 раза.

Паводле яго слоў, за 10 гадоў у рамках ЕАЭС аб'ём прамысловай вытворчасці Рэспублікі Беларусь павялічыўся амаль на 20 % і склаў 62 млрд долараў.

— Пры гэтым беларускі бок неаднаразова заяўляў аб неабходнасці прыняцця дзейсных мер, накіраваных на ўмацаванне тэхналагічнага суверэнітэту ЕАЭС, — падкрэсліў Прэм'ер-міністр. — Аб'яднаўшы нашы ўнікальныя кампетэнцыі, мы зможам стварыць эксклюзіўную прадукцыю, дасягнуць яшчэ большага эфекту. Выкарыстанне гэтых патэнцыялаў павінна стаць задачай стратэгічнага развіцця саюза.

### СПЕКТР ПРАПАНОЎ ШЫРОКІ

Прэм'ер-міністр Беларусі адзначыў, што нашай краіне ёсць што прапанаваць еўразійскім партнёрам:

— Мы валодаем значным вопытам у машынабудаванні, нафтахіміі, дрэваапрацоўцы, развіцці аграпрамысловага комплексу.

Ён нагадаў, што Беларусь уваходзіць у лік лідараў па вытворчасці кар'ерных самазвалаў гандлёвай маркі «БЕЛАЗ»:

— Адна з мадэляў занесена ў Кнігу рэкордаў Гінеса як самы вялікі аўтамабіль. Сёння вы можаце бачыць яго на пляцоўцы перад выставачным цэнтрам, як і ўзоры тэхнікі беларускіх машынабудаўнікоў.

Аляксандр Турчын падкрэсліў, што беларускія тавары ў ЕАЭС даўно добра ведаюць і любяць, а брэнд «Зроблена ў Беларусі» стаў для многіх сінонімам якасці.

— І мы маем намер свой аўтарытэт у гэтым пытанні падтрымліваць.

Беларусь уносіць важкі ўклад і ў забеспячэнне харчовай бяспекі ЕАЭС:

**— У 2024 годзе намі экспартавана прадукцыі на суму каля 7 мільярдаў долараў. Доля нашай краіны ва ўзаемным гандлі саюза харчовымі таварамі перавышае 40 %. Мы заўсёды гатовы гарантаваць пастаўкі якаснага беларускага харчавання на рынкі партнёраў па ЕАЭС.**

Яшчэ адзін кірунак, на якім акцэнтаваў увагу Прэм'ер-міністр, — IT-сектар:

— Наша краіна ўваходзіць у лік сусветных лідараў па экспарце IT-паслуг на душу насельніцтва. Мабільны дадаткі, створаныя рэзідэнтамі айчыннага Парка высокіх тэхналогій, выкарыстоўвае звыш 1 мільярда людзей больш чым у 190 краінах свету.

Ён выказаў гатоўнасць беларускага боку да актыўнага ўдзелу ва ўзгадненні лічбавых палітык дзяржаў — членаў ЕАЭС, развіцці кібербяспекі і абароны ад лічбавых пагроз, стымуляванні інавацый і падтрымцы стартапаў у сферы інфармацыйных тэхналогій.

### МАГЧЫМАСЦЬ ЗВЕРЫЦЬ ГАДЗІННІКІ

Гаворачы аб тэме форуму, Аляксандр Турчын канстатаваў невыпадковасць яе выбару:

— Прэзідэнт Беларусі ў звароце да кіраўнікоў дзяржаў ЕАЭС адзначыў, што 2025 год з'яўляецца знакавым: завяршаючы пяцігодку рэалізацыі стратэгічных кірункаў развіцця еўразійскай інтэграцыі, мы фарміруем падмурак для паспяховага старту новага этапу, закладзенага ў дэкларацыі «Еўразійскі эканамічны шлях».

Ён звярнуў увагу на тое, што гэтыя два дакументы лепш за ўсё адказваюць на галоўныя пытанні аб выніках і перспектывах інтэграцыйнага будаўніцтва на еўразійскай прасторы.

— Дыялог аб стратэгіі Еўразійскай эканамічнай інтэграцыі, яе выніках і перспектывах дазволіць дзяржавам-членам зверыць гадзіннікі для далейшага сумеснага руху наперад, — выказаў упэўненасць Прэм'ер-міністр і пажадаў удзельнікам форуму плённай работы і паспяховых перагавораў.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

ЕЎРАЗІЙСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ

# ТРЭК НА РАЗВІЦЦЁ

## Інтэграцыя інтэграцый — перспектыўны шлях

**Віцэ-прэм'ер, старшыня Савета ЕЭК Наталля ПЯТКЕВІЧ, выступаючы ўчора перад удзельнікамі панэльнай сесіі «Дыялог міждзяржаўных аб'яднанняў: спалучэнне эканамічных патэнцыялаў і паглыбленне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва», падкрэсліла, што пазіцыя Беларусі прыхільнасці інтэграцыйнай тэматыцы пранізвае ўсю палітыку нашай краіны.**



Фота БелТА.

— Любое падзенне або турбулентнасць — гэта заўсёды магчымасць пачаць пункты росту. І гэты момант важна не прапусціць, — падкрэсліла Наталля Пяткевіч. — Менавіта ў кантэксце магчымасцяў у свой час Аляксандр Рыгоравіч (Лукашэнка. — **«Зв.»**), Прэзідэнт нашай краіны, прапанаваў ідэю аб інтэграцыі інтэграцый. Тое, што падыходзіць найбольш у цяперашняй сітуацыі.

Спікер патлумачыла: у сучасных умовах, калі многімі заходнімі «партнёрамі» адпрэчваецца ідэя мірнага суіснавання, актуальнасць беларускай ініцыятывы толькі вырасла:

— Мы прапануем замест рэгіянальнай ізаляцыі, пагібельнага пратэкцыянізму, які абнуляе перавагу свабоднага гандлю — большую адкрытасць, паглыбленую кааперацыю, удзел прадпрыемстваў нашых краін у вытворча-лагістычных ланцужках на больш шырокім інтэграцыйным контуры.

На думку старшыні Савета ЕЭК, у гэтай частцы вопыт ЕАЭС з'яўляецца ўнікальным, таму што гэта інтэграцыйнае аб'яднанне лагічна і гістарычна склалася, мае вопыт суіснавання ў рамках іншых інтэграцыйных аб'яднанняў і нават асаблівай супольнасці, якой быў Савецкі Саюз. І сёння гэты досвед трансфармаваны ў эканамічны саюз.

Наталля Пяткевіч нагадала, што тэмпы фінансавага росту ў рамках гэтага інтэграцыйнага аб'яднання істотна пераўзыходзяць сярэднесусветныя паказчыкі:

— Выраслі аб'ёмы ўзаемнага гандлю, якія дасягнулі ўжо каля 100 мільярдаў долараў. Доля нацыянальных валют ва ўзаемных разліках перавысіла 92 %. Але самае галоўнае — гэты саюз прыносіць выгаду кожнай краіне, кожнаму ўдзельніку, і гэта адчулі як дзяржаўныя прадпрыемствы, так і бізнес.

Віцэ-прэм'ер канстатавала, што адна з найважнейшых задач аб'яднання — сфарміраваць агульную прастору кааперацыйнага ўзаемадзеяння ва ўсіх галінах. На яе думку, апошняму будуць спрыяць рэалізацыя і далейшае ўдасканаленне існага механізму фінансавання сумесных кааперацыйных праектаў:

— Гэта прыносіць вынік, няхай складана, але працэс пачаўся. Не проста ідэя кааперацыі праекта, але і механізм рэалізацыі ў выглядзе фінансавання ў ЕАЭС (з'явіўся ўжо інструмент). Такі фармат супрацоўніцтва стане эфектыўным інструментам прыцягнення ў ЕАЭС перадавых тэхналогій і кампетэнцый, цэнтры распрацоўкі якіх сёння ссоўваюцца ў нашу глабальную большасць, туды, дзе раней гэтых цэнтраў не было.

Наступным кірункам намаганняў можа стаць развіццё сельскай гаспадаркі, упэўнена Наталля Пяткевіч:

— Нягледзячы на рост аб'ёмаў вытворчасці сельгаспрадукцыі, мы застаемся залежнымі ад заходніх імпартных тэхналогій. Аб'яднаўшы нашы намаганні, мы можам забяспечыць і выкарыстоўваць трансфер тэхналогій і тым самым выйсці на перадавыя пазіцыі і ў сферы АПК.

Лагістычная сфера, на думку спікера, застаецца лакаматывам інтэграцыі ва ўсім свеце, уключаючы ЕАЭС. На яе думку, удзельнікам «пяцёркі» неабходна ўдасканальваць дзеючыя лагістычныя ланцужкі ўнутры саюза і развіваць новыя ў рамках транспартна-лагістычнай сістэмы вялікай Еўразіі:

— Наша геапалітычнае размяшчэнне прадвызначае стварэнне гэтых транспартных артэрый практычна з усім светам. І апошняму трэба надаць прыярытэтнае значэнне.

Што датычыцца міжнароднага ўзаемадзеяння, Наталля Пяткевіч выказала думку, што цяпер «пяцёрка» знаходзіцца на шляху гістарычнага перыяду, калі ЕАЭС ужо не існуе як толькі ўзаемадзеянне паміж рознымі краінамі і ўдзельнікамі.

— Мы пайшлі далей, і акрамя класічнага трэка краін-назіральнікаў, запрошаных гасцей і гэтак далей мы выбудоўваем адносіны як двухбаковыя паміж аб'яднаннем ЕАЭС і трэцімі краінамі (і гэты трэк трэба прадоўжыць і ў рамках узаемадзеяння паміж інтэграцыйнымі аб'яднаннямі СНД, ШАС, БРІКС, АСЕАН і гэтак далей), так і з іншымі краінамі. Гэта наша месца, месца ЕАЭС у глабальным свеце. Гэта і пашырэнне эканамічных магчымасцяў і эканамічнага патэнцыялу як асобных краін-удзельніц, так і ЕАЭС на міжнароднай арэне, — рэзюмавала старшыня Савета ЕЭК.

**Маргарыта ЗАРОЎКІНА.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | Копыльское райпо, г. Копыль, пл. Ленина, 21 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 **(www.ipmtorgi.by)** |
| **Предмет электронного аукциона** | |
| **Магазин «Слуцкий край» 361.5 кв. м.** (здание специализированное розничной торговли, инв. № 642/С-11416, составные части: цокольный этаж). Адрес: **Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, ул. Партизанская, д. 1Б.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0.0422 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 08.11.2041) для размещения объектов розничной торговли. Ограничения (обременения) прав на зем. участок: природные территории, подлежащие спец. охране | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 200 000,00 бел. руб.** (снижена на 24 %) | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** дней после подписания договора купли-продажи. По лоту предусмотрено предоставление рассрочки платежа сроком до 2 месяцев с момента заключения договора купли-продажи при первоначальном взносе в день подписания договора в размере не менее 50 % от цены продажи с учетом внесенного задатка | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by). Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель торгов, либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 4 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.05.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 11.07.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие принимаются по 10.07.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Передвижная механизированная колонна № 69» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

**ГАРАЖ**

**с инв. № 623/С-61023 общ. пл. 922 кв. м, адрес: Минская обл., Узденский р-н, Озерский с/с, д. Королево, ул. Центральная, 3/13,**

**НЕФТЕБАЗА**

**с инв. № 623/С-62013 общ. пл. 49,7 кв. м (составные части и принадлежности: нефтебаза, нефтебаза, ограждение, ограждение), адрес: Минская обл., Узденский р-н, Озерский с/с, д. Королево, ул. Центральная, 3/14 (далее – объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 625682506101000187 (право постоянного пользования) площадью 2,7066 га по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Озерский с/с, д. Королево, ул. Центральная, 3.**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения (2,7066 га).

Объекты обременены договорами аренды (сведения можно получить у организатора торгов).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 340 680,00** бел.руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 34 068,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301 21082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **29.07.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.07.2025** до **17.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 136-31-11, 102-21-17. Тел. для осмотра: 8 (0177) 74-44-65, 8 (029) 680-16-43.**

УНН 600000236

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# АД ШТУЧНАГА ІНТЭЛЕКТУ ДА ПРАМЫСЛОВЫХ РОБАТАЎ

## Як прайшоў першы дзень IV Еўразійскага эканамічнага форуму ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры

У рамках дзелавой праграмы форуму прайшлі дзясяткі мерапрыемстваў, тэматычных секцый, цікавых сустрэч. Тэматыка абмеркаванняў самая разнастайная — ад выкарыстання штучнага інтэлекту ў вытворчых працэсах і прамысловых робатаў да мытнага рэгулявання на прасторы ЕАЭС. Як прайшоў першы дзень форуму — у нашым матэрыяле.




### ДЫЯЛОГ ІНТЭГРАЦЫЙ

**Старшыня Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Бакытжан САГІНТАЕЎ** на панэльнай сесіі «Дыялог міждзяржаўных аб'яднанняў: спалучэнне эканамічных патэнцыялаў і паглыбленне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва» падкрэсліў:

— «Дыялог інтэграцый» — адзін з галоўных трэндаў развіцця сусветнай эканомікі. Значнасць убудавання Еўразійскага эканамічнага саюза ў глабальную сістэму гандлёва-эканамічных адносін нязменна падкрэсліваецца кіраўнікамі ўсіх пяці краін саюза.

Кіраўнік Калегіі ЕЭК адзначыў, што камісія сумесна з дзяржавамі-членамі стварыла неабходную інфраструктуру для сістэмнага міжнароднага дыялогу.

Як нагадалі ў прэс-службе ЕЭК, заключана 12 мемарандумаў аб супрацоўніцтве з рэгіянальнымі міждзяржаўнымі аб'яднаннямі. Дыялог з імі служыць падмуркам для абмену найлепшым вопытам і нарошчвання тэмпаў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Шырокая сетка кантактаў у камісіі і саюза склалася па ўсім свеце, уключаючы Еўразію, Лацінскую Амерыку, Афрыку. Сярод ключавых партнёраў, з якімі паспяхова развіваецца дыялог, — СНД, ШАС, АСЕАН, МЕРКАСУР, БРІКС, Нарада па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі, Андская супольнасць, Амерыканскі агульны рынак, Афрыканскі саюз, Ціхаакіянскі альянс і іншыя.

Асноўным інструментам пашырэння геаграфіі партнёрства з'яўляюцца гандлёвыя пагадненні. Яны заключаны з В'етнамам, Іранам, Сербіяй, Кітаем, на фінальнай стадыі — перагаворы аб заключэнні пагаднення з Інданезіяй.

Дарэчы, сёння, 27 чэрвеня, на палях пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета намечана падпісанне яшчэ двух гандлёвых пагадненняў — з ААЭ і Манголіяй.

— Сёння ЕАЭС зацікаўлены не толькі ў прыняцці пазітыўнага вопыту інтэграцыйнага будаўніцтва іншых арганізацый. Будучы самастойным аб'яднаннем, мы гатовыя прапанаваць партнёрам уласныя найлепшыя практыкі. Спалучэнне нашых эканамічных патэнцыялаў здольнае кратна ўзмацніць эфект ад узаемавыгаднага супрацоўніцтва, — рэзюмаваў кіраўнік Калегіі ЕЭК.

### РОБАТЫ — УЖО РЭАЛЬНАСЦЬ

Абмен вопытам і тэхналогіямі паміж дзяржавамі — членамі ЕАЭС можа значна паскорыць працэс укаранення прамысловых робатаў і робататэхнічных сістэм на прадпрыемствах саюза. Гэту думку агучыў **намеснік міністра прамысловасці Беларусі Андрэй КУЗНЯЦОЎ** падчас круглага стала «Прымяненне рабатызаваных сістэм як фактар росту канкурэнтаздольнасці прамысловых прадпрыемстваў дзяржаў — членаў ЕАЭС».

Паводле яго слоў, стварэнне сумесных прадпрыемстваў і даследчых лабараторый стане дадатковым крокам да ўмацавання кааперацыйных і інтэграцыйных працэсаў, а таксама пазіцый ЕАЭС у гэтым перспектыўным кірунку.

Андрэй Кузняцоў заклікаў удзельнікаў круглага стала да супрацоўніцтва па пытаннях распрацоўкі і ўкаранення рабатызаваных рашэнняў, што будзе спрыяць аўтаматызацыі тэхналагічных і бізнес-працэсаў на вытворчасцях і павышэнню, стварэнню інавацыйнай інфраструктуры.

Намеснік міністра прамысловасці Беларусі таксама праінфармаваў, што холдынгі сістэмы Мінпрама актыўна выкарыстоўваюць робататэхнічныя сістэмы і аўтаматызаваныя лініі ў вытворчым працэсе (напрыклад, «БелаўтаМАЗ», «Аўтакампаненты», «МТЗ-ХОЛДЫНГ», «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ», «Магілёўліфтмаш», а таксама «Атлант»).

— Арганізацыі прамысловай галіны актыўна вядуць работу па распрацоўцы стратэгій рабатызацыі і аўтаматызацыі на сярэднетэрміновы (2025—2030 гады) і доўгатэрміновы (да 2035 года) перыяды. Паводле папярэдніх звестак, на мэты рабатызацыі і аўтаматызацыі арганізацыі сістэмы Мінпрама ў сярэднетэрміновай перспектыве (2025—2030 гады) плануюць накіраваць каля 2,1 мільярда беларускіх рублёў, — паведаміў Андрэй Кузняцоў.

Ён звярнуў увагу, што дзяржаўныя падтрымка і стымуляванне з'яўляюцца ключавымі для стварэння спрыяльных умоў развіцця робататэхнікі. Так, у Беларусі ажыццяўляюцца інтэграванне задач па рабатызацыі ў дзяржаўныя праграмы развіцця прамысловасці і лічбавізацыі, навукова-тэхнічныя распрацоўкі па падтрымцы навуковых даследаванняў у галіне робататэхнікі на базе ўніверсітэтаў і навукова-даследчых інстытутаў.

— Паспяховая рэалізацыя робататэхнічных праграм патрабуе комплекснага падыходу. Неабходна таксама развіваць





адукацыйныя праграмы па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне робататэхнікі, а таксама падтрымліваць стартапы і інавацыйныя праекты. Гэта дасць магчымасць стварыць экасістэму, якая будзе садзейнічаць далейшаму росту і ўкараненню рабатызаваных тэхналогій, — выказаў упэўненасць намеснік міністра прамысловасці Беларусі.

### ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ У РАБОЦЕ АНТЫМАНАПОЛЬНЫХ ОРГАНАЎ

У ліку пазітыўных змяненняў **член Калегіі (міністр) па канкурэнцыі і антыманапольным рэгуляванні ЕЭК Максім ЕРМАЛОВІЧ** назваў дынамічнае развіццё лічбавай экасістэмы гандлю, што, зрэшты, таксама з'яўляецца пэўным выклікам для канкурэнтных органаў. Развіваецца штучны інтэлект, паведамляе БелТА.

— Мы ўжо цяпер ставім для сябе задачы, як працаваць з гэтымі новымі з'явамі, як навучаць штучны інтэлект, каб ён не пачаў фарміраваць картэлі, і як штучны інтэлект мог бы замяніць нас у антыманапольных органах. Гэта значна, як мне здаецца, знізіла б выдаткі на дзяржаўнае кіраванне. Тым не менш пакуль мы толькі ў пачатку шляху, — падкрэсліў ён.

Максім Ермаловіч прапанаваў правесці дыскусію, кіруючыся прынцыпам пераходу ад агульнага да прыватнага, і разгледзець у першую чаргу агульны погляд на сусветны гандаль і канкурэнцыю.

### ЛІЧБАВІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНА-ПРАЦОЎНАЙ СФЕРЫ

У Беларусі паспяхова функцыянуе лічбавая платформа сацыяльна-працоўнай сферы, якая аб'яднала ўсе інфармацыйныя рэсурсы галіны.

— У гэту пяцігодку мы шчыльна падышлі да адмовы ад папяровага дакументаабароту, паколькі большая частка працэсаў ужо лічбавізавана. Безумоўна, будучая пяцігодка пройдзе пад эгідай не проста трансфармацыі, а праактыўнасці і ўкаранення штучнага інтэлекту ў нашу дзейнасць. Сёлета таксама завяршаюцца работы па пераходзе на праактыўнае прызначэнне пенсій па інваліднасці і іншых сацыяльных выплатах. І ў наступную пяцігодку ўсе магчымыя праактыўныя працэсы мы пераводзім у гэты рэжым, — расказала БелТА **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Юлія БЕРДНІКАВА.**

Запланавана таксама пашырэнне аб'ёму лічбавых дакументаў для стварэння «суперсэрвісаў», каб грамадзяне не клапаціліся аб атрыманні або прад'яўленні дакументаў — усе даныя будуць даступныя праактыўна — праз аўтаматызаваныя сістэмы.

— Укараненне штучнага інтэлекту дапаможа павысіць якасць апрацоўкі даных і аналізу інфармацыі, што дасць магчымасць падняць узровень паслуг, якія аказваюцца, — падкрэсліла намеснік міністра.

